родственница императора Иоанна. В этой сложной ситуации пробудились властные амбиции цесаревны Елизаветы Петровны. В ее окружении  началась подготовка к захвату власти, идеологически обоснованная завещанием Екатерины I, впоследствии нарушенным Елизаветой (по тестаменту Екатерины I право первоочередного наследования имел внук Петра Великого — герцог Голштинский Карл-Петр). Решительности заговорщикам придавали слухи о готовившейся коронации правительницы Анны, желавшей якобы в день своего рождения, 18 декабря, провозгласить себя самодержавной императрицей. Опираясь на гвардейцев и узкий круг приближенных, 25 ноября 1741 г. цесаревна Елизавета пришла к власти, низвергнув императора и правительницу. Так закончилось  единственное в истории Российской империи правление младенца-императора. Судьба экс-самодержца  трагична: уже в ссылке он был разлучен с родителями, находился в заточении и, в конечном счете, был убит в Шлиссельбургской крепости в 1764 г. при попытке подпоручика В. Я. Мировича его освободить [3].

**Литература**

1. Анисимов, Е. В.  Иван VI Антонович / Е. В. Анисимов.— М.: Молодая гвардия, 2008.— 368 с.— (ЖЗЛ).

2. Сведения об Иоанне или Иване Антоновиче, правнуке царя Иоанна Алексеевича [Из рукописей Императорской С.-Петербургской публичной библиотеки] // Русская старина, 1894.— Т. 82.— № 12.— С. 82–97.— Сетевая версия И. Ремизова, 2006.— Режим доступа: http://memoirs.ru/texts/ioann_ant.htm.— Дата доступа: 20.10.2011.

3. Династия Романовых: Иван (Иоанн) Антонович Шестой Романов [Электронный ресурс] / Библиотекарь.Ру.— М., 2011.— Режим доступа: http://bibliotekar.ru/rusRomanov/29.htm.— Дата доступа: 20.10.2011.

## Калекцыя тытунёвых люлек з Музея гісторыі Мінска

*Курловіч-Бяляўская П. С., студ. V к. БДУ,*
*навук. кір. Ваганава А. М.,  канд. гіст. навук, дац.*

У 2002–2004 гг. у Мінску праводзіўся археалагічны нагляд і выратавальныя археалагічныя раскопкі на месцы будаўніцтва шматузроўневага гаража-стаянкі з аб’ектамі грамадскага прызначэння на вул. Няміга. Кіраўніцтва работамі ажыццяўляў С. В. Тарасаў [1]. У выніку праведзеных даследаванняў была сабрана калекцыя тытунёвых люлек, якая складаецца з 63 экземпляраў (цэлых вырабаў і іх фрагментаў) [2]. Яна перададзена на захоўванне ў Музей гісторыі Мінска (камісію па яго стварэнні) у 2006 г. Яе аналіз праводзіўся аўтарам у 2011 г.

Традыцыйна ўсе тытунёвыя люлькі падзяляюцца на дзве вялікія групы — «турэцкія» і «галандскія». Першыя складаюцца з полай галоўкі (тулава) з ча-

шачкай (місачкай) для тытуню і цэўкі з гняздом для цыбука. Другія адрознівае сыравіна (высакаякасная белая гліна) і доўгі маналітны цыбук. Большасць люлек (53 фрагменты) належыць да так званых «турэцкіх». Сярод іх сустракаюцца выробленыя ў форме (самы распаўсюджаны спосаб фармоўкі) і выкананыя на ганчарным коле (3 вырабы). Фармовачная маса ўяўляе сабой чырвоную гліну (21 экземпляр), белую (19 экземпляраў) ці сумесь чырвонай і белай (13 экземпляраў). Згодна з характарам апрацоўкі паверхні вылучаюцца тэракотавыя люлькі (22 вырабы), глянцаваныя (9 вырабаў), паліваныя (12 вырабаў, з іх 9 пакрыты рознага кшталту зялёнай палівай, 2 — рудой і 1 — карычневай), дымленыя (3 вырабы), пафарбаваныя ў чырвоны колер (6 экземпляраў) і адна люлька, ангабаваная белай глінай па чырвонай. Сустракаюцца люлькі неарнаментаваныя, а таксама з разнастайным аздабленнем, як правіла, нанесеным пры дапамозе тэхнікі штампоўкі. Таксама ў адзначанай калекцыі прысутнічаюць дзве тытунёвыя люлькі незвычайнай формы: адна з іх у выглядзе чаравічка, а другая — жаночай галавы.

Найбольшую цікавасць выклікае частка калекцыі, якая складаецца з 11 экземпляраў «турэцкіх» люлек. Усе яны былі знойдзены ў яме № 2, што ўяўляла сабой рэшткі калодзежа [1, с. 5]. Гэтыя люлькі выраблены ў двухчастковай форме з сумесі чырвонай і белай гліны. Марфалагічна такія вырабы нагадваюць шырока распаўсюджаны тып люлек, які сустракаецца і ў гэтай калекцыі, і на іншых помніках, такіх як Віцебск [3, с. 53–55], Масква [4, с. 56–57], гарады Палтаўшчыны [5, с. 36–38] і г. д. Іх паверхня звычайна глянцаваная. Характэрны штампаваны арнамент (гірлянды кветачак, ялінкі, адбіткі, нанесеныя пунсонам). Гэтыя люлькі маюць прамое венца, доўгую вертыкальную шыйку, пакатае плечыка і акруглае донца. Сярод дадатковых элементаў марфалогіі вылучаюцца кіль і валік па краі цэўкі. Сустракаюцца вырабы са светлай гліны, сярод іх фарбаваныя ў чырвоны колер ці чырвонаглянцаваныя. Такія тытунёвыя люлькі звычайна маюць клеймы на цэўцы. Цікава, што, па матэрыялах Масквы, гэтыя клеймы імітуюць арабскія [4, с. 57].

Экземпляры з калекцыі Музея гісторыі Мінска, якія нас цікавяць, датуюцца XVIII ст., таму што разам з імі была знойдзена манета XVIII ст. [1, с. 57] і памадная банка [1, с. 52]. Гэтыя люлькі з’яўляюцца бракаванымі вырабамі, якія былі адсеяны адразу пасля фармоўкі і абпалу. Гэта доказ таго, што паленне тытуню ў Мінску ў адзначаны час было распаўсюджана настолькі, што вытворчасць уласных тытунёвых люлек тут стала неабходнай. Яшчэ адным пацверджаннем гэтага маглі быць знаходкі формаў, у якіх ствараліся люлькі. Але гэта катэгорыя вырабаў нешматлікая паўсюдна [5, с. 58], што цалкам дазваляе меркаваць аб тым, што яны маглі быць драўлянымі. Улічваючы нетрываласць дрэва як матэрыялу, можна з вялікай доляй верагоднасці зазначаць, што яны не захаваліся. Цікава, што ўсе згаданыя вырабы маюць аднолькавую выяву ў выглядзе завітка каля края цэўкі. Яна можа з’яўляцца кляймом.

Аналагічныя бракаваныя вырабы былі знойдзены В. М. Ляўко пры раскопках Віцебска [3, с. 54].

У адзначаную калекцыю таксама ўваходзіць 10 экземпляраў «галандскіх» тытунёвых люлек. Аднак з іх толькі два вырабы ўяўляюць сабой знаходкі галовак, астатнія — фрагменты цыбукоў, што не паддаюцца інтэрпрэтацыі.

Такім чынам, пасля агляду тытунёвых люлек з калекцыі Музея гісторыі Мінска можна зрабіць выснову, што паленне тытуню з'явілася ў горадзе ў XVII ст., а ў XVIII ст. пашырылася настолькі, што стала запатрабаванай уласная вытворчасць люлек. Таксама ў Мінску ёсць вырабы з выкарыстаннем усіх тагачасных тэхналагічных прыёмаў, імпарт з Захаду і Усходу.

**Літаратура**

1. Тарасаў, С. В. Справаздача аб археалагічных раскопках і археалагічным наглядзе ў г. Мінску на аб'екце "Шматузроўневая гараж-стаянка з аб'ектамі грамадстка-ганлёвага прызначэння на вул. Няміга ў Мінску" ў 2002–2004 гг. Адз. зах. 2363, 2006 / Архіў Інстытута гісторыі НАН Беларусі.

2. Калекцыя С. В. Тарасава з раскопак Мінска ў 2002–2003 гг. / Музей гісторыі Мінска.

3. Левко, О. Н. Средневековое гончарство северо-восточной Белоруссии / О. Н. Левко.— Мінск: Навука і тэхніка, 1992.— 63 с.

4. Розенфельдт, Р. Л. Московское керамическое производство XII–XVIII вв. / Р. Л. Розенфельдт; под общ. ред. Б. А. Рыбакова // Археология СССР. Свод археологических источников.— М.: Наука, 1968.— 124 с.

5. Люлька в історії та гончарстві України: у 2 кн.— Опішне: Українське Народознавство, 2008.— Кн. 1: Глиняні люльки XVII–XVIII століть (за матеріалами Полтавщини) / О. Коваленко.— 2008.— 144 с.

## Проблема культурной интеграции иммигрантов на примере Франции

*Лагун В. А. II к. БГУ,*
*науч. рук. Вашкевич А. Е., канд. юр. наук, доц.*

Франция традиционно считается самой привлекательной страной для иммигрантов. Последние рассматривались не только в качестве дешевой и нетребовательной рабочей силы, необходимой для нормального функционирования общества, но также являлись частичным решением демографической проблемы, связанной со старением населения. Иностранцы, прибывающие в страну преимущественно из Европы (по данным на 1968 год — 76,4%, из Азии и Африки — 22,5%) [1], достаточно легко устраивались на работу. Некоторые из них потом возвращались на родину, другие оставались во Франции, чтобы влиться в жизнь государства, став полноправными гражданами.

Массовая иммиграция стала проблемой в результате мирового экономического кризиса 1973–1975гг., который вызвал стагнацию и рост безработицы,